

На фото историк и правозащитник Владимир Кравченко

Чем интересна история этих зданий постройки начала XX века?

По моим данным, здание штаба и примыкающее к нему пожарное депо использовались для размещения отдельных органов ставки царя в годы Первой мировой войны.

В то время граница Могилева была вдали от железнодорожной станции. Последний городской дом находился в районе современной площади Ленина. Площадь Ленина и храм трех святителей – это окраина города. Дальше до железнодорожного вокзала было практически чистое поле. Среди этого поля отдельными точками были дома наиболее известных горожан – их загородные особняки. То, что потом стало штабом и пожарным депо, являлось одним комплексом - домом богатого человека, где были жилые комнаты и комнаты приема гостей, и хозяйственные постройки.

То, что жил царь в Могилеве, это общеизвестно, но кроме того были и различные другие здания, где находилась охрана царского поезда, квартирмейстеры, хозяйственные службы, разведка, планирование военных операций.

Здание штаба находилось рядышком с железной дорогой. Причем железная дорога в тот период времени являлась запасной, а не основной. И вот на запасных путях в разных частях города в разное время размещался царский поезд. На железнодорожном вокзале если этот поезд и останавливался, то очень на короткое время. Все-таки безопасность царя для Российской империи была превыше всего, и этот поезд загоняли на запасные пути в разные части города, для того чтобы разведка противника не могла знать точное месторасположение руководителя воинских формирований России.

Все мало-мальски пригодные для проживания высоких чинов здания, для размещения рабочих кабинетов использовались. Местные жители, конечно, вынуждены были потесниться. Поэтому ничего удивительного в том, что эта территория потом стала использоваться под военную часть, потому что место царского поезда было окружено и забором, и охраной. И подойти к этому поезду не было никакой возможности.

Как сохраняются эти здания сегодня?

В этом году во время отчетно-выборной конференции могилевского отделения общества охраны памятников представитель отдела культуры Могилевского горисполкома заявила, что они будут обращаться от имени города к министерству культуры с просьбой снести эти здания.

На плане города, который еще предыдущий градоначальник Шориков опубликовал в одном иллюстрированном журнале, ни здания штаба, ни пожарного депо не предусмотрено. Только современные здания из стекла и бетона. Это город-новостройка и там не должно быть ни одного старого здания. Поэтому ничего удивительного, что сегодня составляются лживые по содержанию акты о состоянии домов бывшего военного городка.

В принципе здания находятся в хорошем состоянии, хотя уже стекла во многих местах побиты, появилась сырость и прочее. Это понятно, поскольку они не используются уже почти 10 лет.

Там есть сторож, бегают три собаки. Но реальной охраны нет. Чтобы здание сохранялось, его нужно отапливать, использовать. А если никто даже текущий ремонт этого здания не проводит, то оно пока будет разрушаться, и потом, чтобы восстановить это здание потребуется гораздо больше денег.

Я задаю вопрос - почему не сдать его в аренду? Мне власти отвечают, что они проводят аукционы. Но вот на той же Украине проводятся интернет-аукционы – не надо приходить и платить непонятно какую сумму, если ты участвуешь в аукционе. Люди смотрят цену, и если им подходит, то они сразу забирают. Здесь же у нас какие-то закрытые аукционы, на них не попасть. А если ты попадаешь, то у тебя заранее заберут деньги, только чтобы заявочку твою принять, хотя очередей на эти аукционы вообще нет.

Каким образом, на Ваш взгляд, можно было бы использовать эти здания?

Вот у нас в Буйничах построили этнографическую деревню. Дома крестьян, кузнецов, плотников, которые не имеют ничего общего с домами крестьянина, плотника и кузнеца XIX века. Помещичий дом, который также не имеет ничего общего с помещичьим домом XVIII - XIX века на территории Беларуси. Чему они служат, какой истории учат? Только лишь для получения денег. Здесь же реальный помещичий дом, хозяйственные постройки, центр города, связь. Это можно показывать школьникам. Можно было бы музейную экспозицию развернуть. Если власти не хотят это делать сами, пусть отдадут частной фирме. Но нет, в Буйничах надо строить заново, а старое, которое сохранилось – под уничтожение.



На фото пожарное депо

НАШ МАГІЛЁЎ

http://gazetanm.eu
№78

Надрукавана на ксераксе.
Наклад 299 ас.
Адрас рэдакцыі: Магілёў, вул. Ленінская, 29.
Распаўсюджваецца бясплатна.
gazetanm.eu@gmail.com

Галоўны рэдактар - Вітольд Няўрыда

Незалежнае грамадска-палітычнае выданне горада. 27 жніўня 2014 г.

ГРАМАДСТВА

■ Уладзімір Лапцэвіч

ІОСІФАЎСКІ САБОР – МАРА БЕЛАРУСАЎ І АЎСТРЫЙЦАЎ

Калісьці суверэны дзвюх саюзных імперый Расіі і Аўстра-Венгрыі сустракаліся ў Магілёве. Потым у гонар сустрэчы быў пабудаваны Іосіфаўскі сабор, на месцы якога цяпер знаходзіцца будынак былой гасцініцы “Днепр”, ужо ўнесены ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Тым не менш, гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя Куляшова Аляксандр Агееў упэўнены, што няма сур’ёзных перашкод для з’яўлення копіі храма ў раёне вуліцы Першамайскай.



Працяг на стр.2

В МОГИЛЕВЕ ИСТОРИЧЕСКИЕ ЗДАНИЯ АРМЕЙСКОГО ШТАБА И ПОЖАРНОГО ДЕПО ПОГИБАЮТ БЕЗ ХОЗЯИНА

Здания армейского штаба и пожарного депо, которые находятся на территории бывшего военного городка по улице Крупской, ожидает разрушение, если у них не появится настоящий хозяин, уверен председатель Могилевской областной организации Белорусского общества защиты памятников истории и культуры Владимир Кравченко.

Працяг на стр.4






На фота Аляксандр Агееў

Аляксандр, чым так цікавы Іосіфаўскі сабор?

Іосіфаўскі сабор, для мяне, цікавы перш найперш чыста ў архітэктурным плане. Ён пабудаваны па праекце родапачынальніка рускага класіцызму, нашчадка еўрапейскага паладыянства, архітэктара Мікалая Львова. Адным з першых яго буйных аб'ектаў быў Іосіфаўскі сабор у Магілёве. Гэты сабор цікавы не толькі для нас, але і для ўсіх краін былой Расійскай імперыі, бо быў адным з першых будынкаў у класічным стылі, пабудаваны напрыканцы XVIII стагоддзя.



Двайны купал

Увогуле, у тыя часы гэта быў самы раскошны храм, які існаваў у Магілеве. У гэтым храме многа чаго адбывалася – наведвалі яго не толькі імператары, але і Шаляпін, Ясенін, Камісаржэўская. Не магла абысці помнік і беларуская культурная эліта XX стагоддзя.

У мастацкім плане ён быў вельмі цікавы таму, што ў яго галоўным купале былі зроблены адмысловыя нішы, а таксама другая столь. У другой столі былі намаляваны выявы апосталаў. І паколькі вокны другой часткі двайнога купала не супадалі з праёмамі, якія ішлі знізу, то свет быў рассеяны і стваралася ўражанне, што апосталы проста лётаюць над прыхаджанамі. Або калі мы ішлі па храму да алтара, то падавалася, што неба плыве над намі. То бок ствараўся такі вельмі цікавы эфект. Па тым часе гэта было такое ноў-хаў, адкрыццё творчае.

Сабор быў вялікім па памерах будынкам?

Іосіфаўскі храм быў крыху меншы, чым храм у Падніколлі. Ён быў не самы вялікі ў Магілёве, але адзін з самых прыгожых. І роспісы былі вельмі цікавыя, якія зрабіў адзін з найвыдатнейшых рускіх мастакоў Уладзімір Баравікоўскі.

Таму тут прысутнічае вельмі вялікая мастацтвазнаўчая каштоўнасць. Больш таго, сёння ў Цвярской вобласці Расійскай Федэрацыі ёсць копія гэтага храма, якой Львоў, дарэчы, не надта ганарыўся – копію будаваць было нецікава. Але важна, што ў прынцыпе захаваўся будынак, які амаль такі самы, як наш сабор. Архітэктар унёс дзве нязначныя змены– надбудаваў невялікія вежачкі над саборам. Той будынак знаходзіцца цяпер у занядбаным стане, у дзікай расійскай глушы, дзе людзі ўжо практычна і не жывуць. Але туды можна паехаць і паглядзець такія рэчы, якіх няма ў праекце і якія на фотаздымках не знойдзеш.

Ці засталося штосьці ад Іосіфаўскага сабора ў нашы дні?

Ад Іосіфаўскага сабора зараз захавалася толькі арка, што насупраць будынка былой гасцініцы "Днепр" на другім баку вуліцы Першамайскай. Яе пасля вайны перарабілі. Сёння яна аб'ядноўвае дзве эпохі. Калі экскурсаводы да яе падыходзяць, яны гавораць і пра прыналежнасць яе да Іосіфаўскага сабора, і пра тыя савецкія вайсковыя падраздзяленні, якія вызвалялі Магілёў і назвы якіх напісаны на арцы.

Канешне, раней арка была функцыянальнай - можна было праз не прайсці, калі там была Саборная плошча. Пазней там быў другі праход – і арка ўжо вяла да цырку. Бо за аркай, там, дзе сёння фантан і былы ДК швейнікаў (так званы ў народзе "Дунькін клуб"), быў да вайны цырк.

Але сёння, паўтаруся, тая арка – сімвал дзвюх эпох, і я не думаю, што гэта трэба мяняць.

Ці магчыма аднаўленне Іосіфаўскага сабора, калі месца яго пабудовы занятае іншым, таксама гістарычным будынкам?

На тым самым месцы яго, канешне, не адновіш, бо будынак былой гасцініцы "Днепр" з'яўляецца помнікам эпохі савецкага канструктывізму. У нас у Магілёве толькі некалькі такіх помнікаў, і добра, што яны захаваліся. Для адбудовы сабора можна знайсці нейкае іншае месца.

Дарэчы, праекты аднаўлення Іосіфаўскага сабора ў Магілёве абмяркоўваліся некалькі разоў. Прычым з такімі праектамі выхадзілі на наш парламент дэпутаты і розныя грамадскія дзеячы ад Аўстрыйскай рэспублікі. Яны пачулі, што гэта сабор, пабудаваны ў гонар святога Іосіфа, у памяць аб візіце ў Магілёў у 1780 годзе Іосіфа II – імператара Аўстрыйскай імперыі, калі ён тут сустракаўся з Кацярынай II.

Аўстрыйцам гэта гісторыя спадабалася і яны думалі, як такі праект прафінансаваць, бо ў Аўстрыі, Германіі даволі моцныя ёсць настроі, каб дапамагаць тым тэрыторыям, дзе яны калісьці ваявалі ў гады Другой сусветнай вайны і каторым прынеслі страты. Закончылася гэта абмеркаванне пакуль нічым, але вялося на ўзроўні кіраўніцтва аблвыканкама і былі памкненні, каб нешта зрабіць.

Калі адбудоўваць Іосіфаўскі сабор, то, на мой погляд, найлепей пасавала зрабіць гэта каля Камсамольскага сквера насупраць гарвыканкама, бо сам храм не надта вялікі.



Трыўмфальная арка Іосіфаўскага сабора

У такім выпадку горад адразу набыў бы такія класічныя рысы, бо Іосіфаўскі сабор быў пабудаваны ў класічным стылі - самым папулярным стыль канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў.

■ Станіслаў Дубовік

КАСЦЁЛ СВЯТОГА КАЗІМІРА Ў МАГІЛЁВЕ - ЖАМЧУЖЫНА, ЯКАЯ СХАВАНА АД ЛЮДСКОГА ВОКА

Ёсць у Магілёве будынак, па ўзросце з якім не параўнаецца аніводная пабудова. Гэта касцёл Святога Казіміра, альбо Фарны касцёл, рэшты якога сёння належаць Белтэлекаму, што выкарыстоўвае іх у якасці падсобнай пабудовы.

Датай з'яўлення Фарнага касцёла лічыцца 1604 год, а ініцыятарам яго пабудовы быў будучы кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза. Ёсць звесткі, што грошы на пабудову каталіцкага храма даў адзін з заможных праваслаўных жыхароў Магілёва.

Праўда, пазнейшы выгляд касцёла значна адрозніваецца ад таго, якім ён быў ад самага пачатку. Драўляны будынак значна пацярпеў у пажары, пасля чаго ў 1620-1630 гадах была ўзведзена мураваная пабудова, якую асвяцілі ў 1634 годзе. У храме паставілі арган, а тры алтары ўпрыгожвалі барочныя скульптуры.

Праз два стагоддзі ў 1820-х гадах касцёл зноў зазнаў перабудову і ператварыўся з будынку ў стылі барока ў будынак ў стылі класіцызму.

Нягледзячы на сучасныя тэхналогіі, аднаўленне Фарнага касцёла ў стылі барока некаторымі магілёўскімі гісторыкамі лічыцца не зусім мэтазгодным. Так, кандыдат гістарычных навук Ігар Пушкін лічыць, што сёння ёсць магчымасць аднавіць пабудову пачатку XVII стагоддзя, так як касцёл выглядаў у XIX стагоддзі пасля сваёй пэўнай рэканструкцыі. "Аднавіць стыль эпохі барока, на маю думку, будзе ўжо нерэальна і немагчыма", - распавёў ён "Нашаму Магілёву".

Паводле яго, цяжка сказаць, якія былі інтэр'еры ў Фарным касцёле, якія страчаныя на цяперашні момант.

"На сённяшні дзень унікальнай рэччу там будуць не фрэскі, не нейкае там вонкавае аздабленне, а сама цэгла, якая дайшла да нашага часу. Таму для нас гэта будзе помнік эпохі класіцызму – так, як касцёл выглядаў у XIX стагоддзі пасля сваёй пэўнай рэканструкцыі. Бо гэта самая старжытная мураваная пабудова ў горадзе. Тым больш, што яна знаходзіцца ў дзяржаўным спісе і мы павінны пра гэта ведаць. Бо тое, што там цяпер папросту немагчыма паказваць", - адзначае магілёўскі гісторык, падкрэсліваючы, што паказваць турыстычным групам можна "не нейкую стаянку для аўтамабіляў, не нейкія сметнікі і занядбаны будынак, а прыгожую пабудову, якая нагадвае сваім вонкавым выглядам вядомыя фатаздымкі Фарнага касцёлу XIX стагоддзя".

На думку спецыяліста, ўзяць на сябе выдаткі на рэстаўрацыю храма мог бы Белтэлекам. Пры гэтым гісторык адзначае, што рэканструяваны Фарны касцёл не будзе значна вышэй за тыя пабудовы, якія знаходзяцца побач з ім.


"Пакуль ніхто рэстаўрацыю, рэканструкцыю і даследаванні Фарнага касцёла не праводзіў. І я не думаю, што нехта ўскрываў тое, што там захавалася пад слоем фарбы. Можа захаваліся і нейкія рэшты фрэсак. Ніхто, я ўпэўнены, не праводзіў спецыяльнае археалагічнае даследаванне тэрыторыі побач з ім. А мы ведаем, што пад ім былі вялізарныя скляпенні. Было б вельмі цікава вывучыць іх. Гэта таксама магло б стаць прывабным месцам для тых асобаў, якія будуць прыязджаць у наш горад", - кажа Пушкін.

Пакуль пра касцёл Святога Казіміра не ведаюць не толькі турысты, але і пераважная большасць жыхароў Магілёва. І ўсё гэта з-за таго, што аб прыцягненні грошаў візіцёраў





Фарны касцёл (цяперашні выгляд і выгляд у мінулым)



больш распавядаецца і пішацца, чым робіцца.

Таму застаецца толькі спадзявацца, што стан муроў касцёла, якія праз чатыры стагоддзі дайшлі да нашых дзён, не пагоршыцца.

"Будынак накрыты дахам. Ён выкарыстоўваецца. У такім стане ён можа прастаяць доўга. Ён, у прынцыпе, не разбураецца. На сённяшні момант мы можам сказаць аб тым, што пагроза фізічнага знішчэння будынка пакуль адсутнічае", - адзначае Ігар Пушкін.